Бохан, А. С. Рытм як асноўная характарыстыка беларускага традыцыйнага арнаменту / А. С. Бохан // Этнокультурное развитие Беларуси в XIX – начале XXI в.: материалы междунар. науч.-практ. конф. / редкол. : Т. А. Новогродский (отв. ред.) [и др.]. — Минск: БГУ, 2011. — С. 270 – 274

**А. С. БОХАН**

# РЫТМ ЯК АСНОЎНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА БЕЛАРУСКАГА ТРАДЫЦЫЙНАГА АРНАМЕНТУ

Сёння, калі заходзіць гаворка пра традыцыйны беларускі арнамент, даследчыкі як правіла спрабуюць вызначыць значэнні элементаў арнаментальных кампазіцый, прэпарыруюць арнамент, вырываючы з яго тую ці іншую графему, забываючыся, што маюць найперш справу з мастацкімі творамі.

На жаль, амаль не было спроб даследаваць беларускі традыцыйны арнамент менавіта як мастацкую з'яву, хоць гэта зусім не пярэчыць памкненням разгадаць арнаментальную формулу. Нават калі разглядаць арнамент як сістэму, то неабходна бачыць у ім не толькі сукупнасць нейкіх загадкавых элементаў, але і сукупнасць пэўных колеравых спалучэнняў, пэўных рытмаў. Пластычныя мастацтвы дэманструюць усю шкалу ўзаемаадносін знакавасці і рэчавасці – і гэтым найперш задаецца спецыфіка і найбольш разгорнуты дыяпазон уваходжання пластычных мастацтваў у культуру – ад эстэтычнага пераўтварэння рэчавага асяроддзя да візуалізацыі найбольш тонкіх духоўных сутнасцяў [1, с. 20].

Чаму менавіта рытм заяўлены ў гэтым выступленні як адна з важнейшых характарыстык беларускага традыцыйнага арнаменту? Паводле трапнага вызначэння Э. Сайко: «Рытм – гэта агульны прынцып ажыццяўленнння руху матэрыі, форма і спосаб рэалізацыі і праявы быцця…» [5, с. 11].

Рытм звычайна атаесамліваюць з ходам часу, працэсам. Але час толькі адна з характарыстык рытму. Рытмы падзяляюць на працэсныя і непрацэсныя (формы, што не мяняюцца ў часе і ўяўляюць сабой тое ці іншае рытмічнае ўтварэнне, якое паўтараецца, разгортваецца ў прасторы. Да такіх рытмаў належыць і арнаментальны).

Але трэба помніць, што сам факт успрымання мастацкага твора ўвогуле і арнаменту ў прыватнасці не адбываецца ў адзін момант. Ён праходзіць у часе праз асобныя фазы. Як адзначаў Я. Мукаржоўскі: «Акт успрымання носіць характар дзейнасці». [3] Такім чынам, час усё ж прысутнічае ў арнаментальных кампазіцыях, толькі гэта індывідуальнае адчуванне часу тых, хто ўспрымае арнамент.

Рытм – адзін з галоўных фактараў у арнаменце, менавіта ён кіруе размеркаваннем элементаў арнаменту ў прасторы. Рытм праяўляецца ў выразнай заканамернасці паўтораў элементаў, інтэрвалаў, бардзюраў у арнаментальных кампазіцыях. Ён надае творам пэўныя якасці. У самім рытме закладзена сістэмнасць, якая абумоўлівае сінергійнасць, зладжанасць кампазіцыі. Гэтая зладжанасць выяўляецца ў мерах руху частак і цэлага



Тое, што рытм вызначае вобразнае ўспрыманне арнаменту, можна бачыць, напрыклад, сёння, калі матывы традыцыйнага арнаменту ўжываюцца ў сучасных мастацкіх практыках досыць адвольна, але рытмічны лад, прапарцыянальныя суадносіны элементаў застаюцца пазнавальнымі.

Матыў, безумоўна, з'яўляецца асновай, сэнсавай адзінкай кампазіцыі. Але і сам кампазіцыйны лад, найперш найбольш універсальныя кампазіцыі мае генетычную сувязь з архаічнымі «формуламі» светапогляду. Напрыклад, лінейныя кампазіцыі, якія будуюцца па вертыкалі, адпавядаюць класічнаму члянененню прасторы на ярусы; пашыраны прыём інверсіі падкрэслівае дваістую прыроду той ці іншай з'явы.

Зноў жа, калі вярнуцца да ўспрымання арнаменту як тэксту, непазбежна ўзнікаюць паралелі паміж арнаментальнымі «апісаннямі» і рытмамі чалавечага быцця. Такія параўнанні не беспадстаўныя, псіхолагамі ўжо даўно вызначана, што ў розных працэсах захоўваюцца універсальныя якасці рытму. Гэтыя якасці рэалізуюцца як адносіны і разам, у сукупнасці сістэмы адносін, утвараюць нематэрыяльную структуру формы рытмаў матэрыяльных і матэрыялізаваных аб'ектаў і працэсаў. Адны і тыя ж рытмы могуць аднаўляцца, пераносіцца, паўтарацца. Жывыя і нежывыя, псіхалагічныя і духоўныя працэсы і аб'екты могуць мець аналагічныя рытмы [4, с. 15].

Пры аналізе ўспрымання арнаментальных твораў непазбежна ўзнікае яшчэ адна праблема. Ступень упарадкаванасці арнаменту, зладжанасць мастацкай сістэмы і яе рытмічная арганізацыя часта прыводзяць даследчыкаў да думкі, што магчыма даследаванне арнаменту метадамі дакладных навук. Але пры аналізе кампазіцый неабходна заўсёды мець на ўвазе прыроду арнаментальнага дэкору. Ад самага пачатку гэта быў не стыхійны рытм, не проста ўпарадкаваная форма, а мастацкі твор. Таму падаюцца памылковымі «матэматычныя» падыходы да разумення прыроды арнаменту на творах традыцыйнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Як слушна адзначана даследчыцай арнаменту Л. Буткевіч: «... Аналізы мастацкіх арнаментальных рытмаў, якія праводзяцца, напрыклад, з дапамогай крышталяграфіі, можа і бездакорныя па матэматычным выніку, але тычацца толькі самых агульных заканамернасцяў любых рытмаў, прыродных і мастацкіх, так бы мовіць, на атамарным узроўні, і як скрозь сіта прапускаюць тое, што, уласна, і складае ў арнаменце яго чалавечы змест, абумоўлены сацыяльным вопытам» [2, с. 43].

Дарэчы, спецыялісты ў галіне музычнага мастацтва таксама гавораць пра тое, што выкарыстанне выключна матэматычнай логікі ў вывучэнні рытмічнага боку нотнага тэксту вядзе да скажэння змястоўнасці музычнага твора. Несумненна, што мастацкія творы жывуць па сваіх спецыфічных законах.

Спецыфіка кожнага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва выяўляецца і ў асаблівасцях арнаментальных рытмаў, якія ўжываюцца для стварэння дэкору. Напрыклад, у традыцыйнай выцінанцы метрычны парадак атрымоўваецца пры складанні паперы гармонікам, дынамічная структура на аснове разеткі ўтвараецца пры веерападобным складанні паперы і вар'іраванні велічыняў арнаментальных элементаў, статычныя кампазіцыі будуюцца на аснове люстэркавай сіметрыі, дзе асноўнымі выступаюць узбуйненыя элементы. Розныя тэхнікі выканання вырабаў з



дрэва уплываюць на спецыфіку рытмічнай арганізацыі кампазіцый. Так, у вырабах, аздобленых трохгранна-выемчатай разьбой, пераважна пануюць сятчастыя кампазіцыі з нескладаным рытмічным парадкам ці асобна размешчаныя разеткі, а ў прапілаваных аздобах найчасцей можна ўбачыць люстэркавую сіметрыю ці арнаментальныя стужкі з метрычным размяшчэннем элементаў. Сетка – асноўны спосаб размяшчэння элементаў для набіваных тканін, бардзюры – для тканых вырабаў. Найбольш жа разнастайнымі кампазіцыйнымі прыёмамі характарызуецца мастацкая вышыўка. Размалёўка па дрэве, шкле, тканіне мае блізкую прыроду спосабу выканання і вызначаецца надзвычай свабоднай кампаноўкай элементаў, перавагай раслінных матываў, досыць складанай рытмічнай арганізаванасцю. Але ёсць і агульныя кампазіцыйныя заканамернасці, якія робяць беларускі арнамент пазнавальным.

Па заканамернасцях пабудовы можна вызначыць чатыры віды прыёмаў арнаментальных кампазіцый: 1) арнаментальныя стужкі (фрызы, бардзюры, аблямоўкі); 2) сятчастыя арнаменты, якія запаўняюць паверхню суцэльным узорам (як разнавіднасць існуюць дывановыя арнаменты); 3) разеткі (медальёны) – арнаменты, скіраваныя па некалькіх восях; 4) паркеты (да «паркетаў» належыць любы спосаб суцэльнага запаўнення шматкутнікамі) [7, с. 28].

Рытмічныя заканамернасці ў кампазіцыях разнастайныя па характары. У лінейных кампазіцыях, якія найбольш часта сустракаюцца ў беларускім арнаменце, можна вылучыць два тыпы рытмічных заканамернасцяў: метрычную і рытмічную.

Метрычны парадак характарызуецца паўторам у кампазіцыі аднолькавых палос і роўных інтэрвалаў паміж імі. Ён тыповы для статычных кампазіцый. У кампазіцыях могуць выкарыстоўвацца простыя і складаныя метрычныя парадкі. Першы, калі паўтараецца адна і тая ж форма і адзін і той жа інтэрвал паміж формамі. Прыкладам такога рытму могуць служыць выцінанкі ці аздабленне ганчарных вырабаў, якое складаецца з некалькіх аднолькавых, размешчаных па крузе арнаментальных стужак. Другі, больш характэрны для традыцыйных беларускіх тканін, атрымліваецца спалучэннем двух ці большай колькасці метрычных радоў. Мастацкі вобраз такіх кампазіцый насычаецца шляхам рознага колеравага рашэння палос. Эфект успрыняцця такіх кампазіцый часта дасягаецца дакладным кантрастным супастаўленнем груп палос, аб'яднаннем груп і звядзеннем іх да невялікай колькасці.

Рытмічны парадак характарызуецца паслядоўным ці больш складаным змяненнем форм, якія паўтараюцца, ці інтэрвалаў, альбо і тых і другіх. Пры гэтым ствараецца ўражанне дынамікі кампазіцыі. Такія кампазіцыі будуюцца з дапамогай асіметрыі. Пры стварэнні рытмічных кампазіцый могуць выкарыстоўвацца раўнамерна ўзрастаючы лад кампазіцыі, марудна ўзрастаючы лад кампазіцыі, пас-корана ўзрастаючы лад кампазіцыі. Ускладненне рытмічнага строю кампазіцыі ўскладняе яе эмацыянальнае гучанне.

Адзін з характэрных кампазіцыйных прыёмаў – сятчасты арнамент, калі элементы арнаменту размяшчаюцца ўздоўж прамых ці нахіленых восяў кампазіцыі. Сятчасты арнамент утвараецца нешматлікімі матывамі, найчасцей, спалучэннем пэўнага элемента і рамбічнай сеткі.



Сятчасты арнамент прынята лічыць вытворным ад бардзюрнага. Часта гэтыя кампазіцыйныя прыёмы выкарыстоўваюцца разам. У такіх кампазіцыях рытм вызначае найперш узаемасувязі элементаў.

Ад асаблівасцяў рытму залежыць не толькі эмацыянальнае гучанне. У сятчастых арнаментах (найчасцей у такім відзе кампаноўкі рапортаў як дывановае запаўненне, пабудаванае па прынцыпу сеткі) ясна прасочваецца ўплыў рытму на ўспрыманне ўзаемасувязі паміж элементамі. Шчыльнае, цеснае ўзаемадачыненне элементаў спрыяе напружанаму ўспрыманню кампазіцыі.

Тут неабходна адзначыць, што некаторыя элементы ўтвараюцца за кошт узаемадзеяння іншых. Таму ў пэўных выпадках пераплецення элементаў можна гаварыць пра семантычныя якасці, а не пра семантычныя значэнні такіх узораў. Тэрмін «семантычныя якасці» ў дачыненні да арнаментальных кампазіцый прапанавала даследчыца армянскага арнаменту З. Тараян: «За семантычныя якасці арнаменту прымаюцца тыя яго прыкметы, якія выклікаюць пэўныя настроі. Неабходна адрозніваць семантычныя якасці ад семантычных значэнняў. Семантычныя значэнні характарызуюць асацыятыўныя і сэнсавыя сувязі элементаў і служаць

ключом пры разгадцы сімвалічных ці сюжэтных палажэнняў. А семантычныя якасці – гэта канкрэтныя, але не прадвызначаныя памкненні формы твора, якія фарміруюцца адвольна» [6, с. 1].

Рытм вызначае таксама пабудаваныя па прынцыпу медальёнаў кампазіцыі, якія могуць утвараць рапорты і складацца ў сятчастыя ўзоры . Гэта натуральна, бо і медальёны, і сятчастыя кампазіцыі маюць агульную рысу – размяшчэнне элементаў не па адной восі. Ад змены будовы кампазіцый мяняецца мастацкі вобраз выяў. Калі ў замкнёных разетках назіраецца цэласнасць, статычнасць, то ў сятчастых узорах з чаргаваннем адных і тых жа разетак узнікае адчуванне бясконцасці і непарыўнасці.

Застаецца яшчэ многа адкрытых пытанняў, якія тычацца рытмічнай арганізацыі беларускага традыцыйнага арнаменту. Напрыклад, вельмі важна прааналізаваць падыходы да стварэння арнаментальных кампазіцый у розных відах традыцыйнага мастацтва. Агульная прырода арнаментальных кампазіцый на розных па выкананні вырабах не выклікае сумненняў. Заканамернасць і падабенства яшчэ познепалеалітычнага арнаментальнага аздаблення статуэтак, упрыгожанняў, жытла апісана даследчыцай старажытнага арнаменту Л. Якаўлевай [8, с. 13].

Зразумела, што вывучаць арнамент у адрыве ад утылітарных рэчаў, якія ён аздабляў, немагчыма. У такіх відах мастацтва як кераміка, дрэваапрацоўка, металаапрацоўка менавіта яднанне, гармонія рытмічнай структуры арнаментальнай кампазіцыі і формы рэчы падкрэслівае адметнасць і значэнне вырабу. У гэтым аспекце досыць цікава разабрацца, чым адрозніваюцца кампазіцыі, якія наносіліся на зададзеныя формы пэўных рэчаў, ад тых кампазіцый, што нараджаліся ў працэсе стварэння рэчаў (гэта найперш тканыя вырабы і пляценне). Але, несумненна, ёсць тое, што яднае арнаментальныя кампазіцыі на розных вырабах. Гэта ўласцівыя беларускаму традыцыйнаму арнаменту матывы і рытм.
Можна досыць скептычна ставіцца да рэканструкцыі той семантычнай прасторы, у якой ствараліся першаўзоры. Як правіла, спробы такой рэканструкцыі –



суб'ектыўныя, што дэманструюць некаторыя навуковыя публікацыі апошніх дзесяцігоддзяў, прысвечаныя семантыцы беларускага арнаменту. Безумоўна, як і значэнне слоў успрымаецца рознымі людзьмі па-рознаму, так і элеметы арнаменту набываюць адрознае жыццё ў індывідуальнай трактоўцы кожнага чалавека. Арнаментальныя кампазіцыі займаюць сваё асаблівае месца і ў карціне свету для пэўнага суб'екта, і ў самавызначэнні цэлага этнасу. Аднак, мы абсалютна ўпэўнена можам гаварыць пра захаваныя традыцыяй каноны. Гэта і трывалыя спалучэнні элементаў, і каларыстычнае рашэнне, і рытмічны лад кампазіцыі. Майстры і сёння ў тысячны раз аднаўляюць у сваіх творах спрадвечнае разуменне гармоніі.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Бернштейн, Б. М.* Искусствознание и художественная культура. Вопросы теории и исторического описания: диссертация в виде научного доклада на соискание ученой степени доктора искусствоведения / Б. М. Бернштейн; Московский государственный институт имени М. В. Ломоносова. – М., 1993. – 66 с.

2. *Буткевич, Л. М.* История орнамента / Л. М. Буткевич. – М. : ВЛАДОС, 2004. – 272 с.

3. *Мукаржовский, Я.* Исследования по эстетике и теории искусства / Ян Мукаржовский // [Электронный ресурс]. – Режим доступа: litext. narod. ru/texts/mukar_art. doc: 26.03.2010.

4. *Петров, И. Г.* Сущность ритма и ритмизации как воспроизводимой размерности, последовательности, системности (концептуализация их формы, нормы, синергийности) / И. Г. Петров // Мир психологии. –2002. – № 3 (31). – С. 14–25.

5. *Сайко, Э. В.* Ритмы, «образующие» человека, и человек, образующий ритмы / Э. В. Сайко // Мир психологии. – 2002. – № 3 (31). – С. 3–13.

6. *Тараян, З. Р.* Семантические качества армянского орнамента / З. Р. Тараян. – Ереван: Академия наук армянской ССР, 1978. –10 с.

7. *Тараян, З. Р.* Символы симметрии орнамента в армянском прикладном искусстве / З. Р. Тараян. – Ереван : Изд-во АН АрмССР, 1989. – 199с.

8. *Яковлева, Л. А.* Орнамент в изобразительном творчестве познепалеолитического человека Поднепровья как исторический источник: автореф. дис… канд. ист. наук / Л. А. Яковлева; Ордена Ленина и ордена Трудового Красного Знамени Ленинградский государственный университет имени А. А. Жданова. – Ленинград, 1988. – 16 с.